*А.Р.Агееў (Магілёў)*

# НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ ПЕРШАГА РЭКТАРА МАГІЛЁЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова быў заснаваны ў 1913 г. як настаўніцкі інстытут. У 1918 г. ён быў ператвораны ў педагагічны, у 1919 – у інтытут народнай адукацыі (ІНА), а з 1921 г. па 1923 г. дзейнічаў як практычны інстытут народнай адукацыі (ПІНА).

Многія раннія этапы дзейнасці нашай навучальнай установы застаюцца і сёння маладаследаванымі. Да гэтага часу так і не напісаны біяграфіі першых кіраўнікоў інстытута. У папярэдніх публікацыях аўтар



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

закранаў дзейнасць першага старшыні савета педагагічнага інстытута, ІНА а потым і ПІНА – Яўгена Іосіфавіча Бычкова як кіраўніка ўзначаленай ім установы. Архіўныя пошукі гэтага юбілейнага для універсітэта года дазволілі праліць святло і на некаторыя этапы яго жыццёвага шляху.

У верасні 1918 г. у жыцці Магілёўскага настаўніцкага інстытута адбылася трагічная падзея. Памёр выкладчык гісторыі, геаграфіі і палітэканоміі Міхал Рыгоравіч Руднеў. На яго месца ў штат інстытута быў прыняты будучы ягоны дырэктар – Яўген Іосіфавіч Бычкоў. Уваход у Магілёў 31 кастрычніка 1918 г. войск Чырвонай Арміі прывёў не толькі да ператварэння інстытута ў педагагічны, але і да зменаў у кіраўніцтве інстытута. Дырэктар У.Тычынін як прадстаўнік былой наменклатуры сышоў з пасады, а ўстанову ўзначаліў Я.Бычкоў. Яго дзейнасць на чале інстытута ў цяжкія гады грамадзянскай вайны заслугоўвае павагі і была намі ўжо разгледжана ў артыкуле пра дзейнасць ІНА [3].

Апошнія вядомыя крокі Бычкова на пасадзе старшыні Савета інстытута былі трагічнымі. Ён у 1921 г. узначальваў барацьбу педкалектыва і студэнтаў за захаванне інстытута ў Магілёве. Гомельскія губернскія ўлады настойвалі на ўтварэнні ПІНА ў Гомелі, а магілёўскія ішлі ў іх на павадку. Па сутнасці, адзінай установай, якая выступіла супраць такога рашэння, быў Магілёўскі інстытут. Інстытут застаўся ў Магілёве. Але ўжо 18 кастрычніка 1921 г. Савет інстытута адзінагалосна (!) хадайнічаў перад Губчэка аб вызваленні з-пад варты старшыні Савета інстытута Я.В. Бычкова. “Як незаменнага члена Савета, які адзін знаходзіўся ў курсе спраў фінансавага і вучэбнага характара”. Што стала падставай для арышту Я.В. Бычкова? Яго дзейнасць па захаванні інстытута ў Магілёве (што вельмі верагодна) ці нейкія іншыя прычыны – сказаць цяжка. Да гонару калектыва ІНА адзначым, што, нягледзячы на арышт, на гэтым Савеце Я.В. Бычкоў быў абраны, так бы мовіць, завочна, на тыя кафедры, на якіх ён раней планаваў працаваць [ 3, с.58 – 60 ].

На гэтай сумнай ноце раней і завершвалася вядомая нам біяграфія Яўгена Іосіфавіча. Копія ліста рэктара ПІНА, знойдзеная намі ў музее Магілёўскага педагагічнага каледжа, дапамагла ўстанавіць, што да самага закрыцця практычнага інстытута ў 1923 г. ім кіраваў па-ранейшаму Я.І. Бычкоў. Гэта дазваляе канстатаваць факт вызвалення яго пасля арышту 1921 года. Магчыма, зварот педкалектыва сыграў тут рашаючую ролю. Дадзены ліст падпісаны Бычковым як рэктарам інстытута.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, пасада рэктара ўпершыню з'явілася значна раней, чым традыцыйна прынята было лічыць[1, арк.50 – 51А].

Матэрыяльная база практычнага інстытута перайшла ў 1923 г. да педтэхнікума, які спачатку ўзначальваў Бычкоў. Большасць выкладчыкаў інстытута таксама напачатку працавала ў ім. У тэхнікуме Бычкоў па-ранейшаму выкладаў гісторыю [1, арк. 120, 225]. Але ўжо на працягу першага года дзейнасці педтэхнікума ў яго з'явіўся новы дырэктар. Сляды ж лёсу Я.І. Бычкова тут зноў губляюцца.

Знаходка ў архіве КДБ па Магілёўскай вобласці кантрольна-надзорнай справы на Я.І.Бычкова дазволіла раскрыць новыя, невядомыя старонкі яго біяграфіі [2]. Высветлілася, што Яўген Іосіфавіч нарадзіўся ў 1887г. у вёсцы Новы Быхаў Быхаўскага раёна. Па пашпарту ён быў беларусам і меў імя па бацьку Восіпавіч, што яшчэ больш падкрэслівае яго беларускае паходжанне. У 1910г. Бычкоў скончыў С-Пецярбургскі універсітэт. З 1903 па 1922 год састаяў у партыі РСДРП, але належыў да яе меншавіцкай часткі. Калі верыць справе, то ён быў адным з лідараў Магілёўскай губернскай арганізацыі меншавікоў, і за гэтую дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся органамі НК і ДПУ.

Чарговы раз Яўген Восіпавіч быў арыштаваны 3 верасня 1937г. Магілёўскім РА НКУС БССР. Перад арыштам ён пражываў па вул. Быхаўскай, 27 працаваў загадчыкам учотнай часткі аддзела кадраў Магілёўскай фабрыкі валакна і выкладаў гісторыю на вячэрнім рабфаку. Абвінавачваўся Бычкоў у антысавецкай агітацыі і прапагандзе па артыкулу 72 КК БССР. У віну яму ставілася як меншавіцкае мінулае, так і трацкісцкая дзейнасць. Праз 6 дзён пасля арышту 9 верасня Асобай тройкай НКУС БССР Я.І.Бычкоў быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, а растраляны 4 лістапада 1937г. Так ва ўзросце 50 гадоў скончылася жыццё першага ў гісторыі МДУ рэктара. Рэабілітаваны ён быў толькі 16 студзеня 1989г. Спадзяемся, што далейшыя пошукі дазволяць аднавіць цікавую біяграфію Я.І.Бычкова.

**Літаратура:**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – ф. 42, вып. 1, спр. 1452.

2. Архіў УКДБ РБ па Магілёўскай вобласці. - Кантрольна -надзорная справа № 9737сн.

3. *Агееў А.Р.* Да гісторыі дзейнасці інстытута народнай адукацыі у Магілёве // Весник Могилевского государственного университета им. А.А. Кулешова – 2000. – № 1. – С. 51 – 60.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова